# ПРАМОВА САКРАТАРА ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў) БЕЛАРУСІ тав. ПАНАМАРЭНКА

Таварышы! Пытанні, стаяўшыя на парадку дня з'езда, — вырашаны. Работа нашага з'езда закончана.

З'езд яшчэ раз з новай сілай прадэманстрыраваў згуртаванасць Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі вакол Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і вялікага нашага правадыра таварыша Сталіна.

Няма той крэпасці, таварышы, якой не маглі-б узяць большэвікі. Будзем яшчэ мацней, сільней, таварышы, працаваць над далейшым уздымам нашай прамысловасці і паляпшэннем яе работы ва ўсіх напрамках, над далейшым развіццём соцыялістычнай сельскай гаспадаркай і ўсямерным паляпшэннем і ўмацаваннем усіх яе звенняў. Будзем і надалей развіваць навуку, культуру і мастацтва вялікага беларускага народа. Будзем памнажаць і ўмацоўваць сувязі з беспартыйнымі масамі, павышаць рэволюцыйную пільнасць і ўпорна працаваць над далейшым умацаваннем КП(б)Б.

XVIII з'езд Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі прайшоў на высокім ідэйна-палітычным узроўні. Большэвіцкай крытыкай і самакрытыкай ускрыў многа недахопаў у рабоце партыйных, савецкіх і гаспадарчых арганізацый. Трэба па-большэвіцку ўзяцца за знішчэнне гэтых недахопаў.

Таварышы, большэвікі Беларусі жывуць і працуюць на грані двух светаў. Перад Комуністычнай партыяй Беларусі ў гэтай сувязі стаяць асаблівай важнасці задачы. Мы ні на мінуту не павінны забываць указанняў нашага правадыра аб капіталістычным акружэнні і яго выніках. Будзем-жа і надалей выкрываць і бязлітасна выкарчоўваць і граміць ворагаў народа, агентаў капіталістычных разведак. Будзем нястомна працаваць над умацаваннем магутнасці нашай савецкай дзяржавы і трымаць з'яднаны беларускі народ у стане поўнай мабілізацыйнай гатоўнасці, каб у любы момант, у любы дзень, у любую мінуту ніякія фокусы нашых ворагаў не маглі застаць нас знянацку.

Беларуская партыйная арганізацыя, манолітная, згуртаваная вакол сталінскага ЦК, вакол таварыша Сталіна, зробіць усё, каб быць адной з самых баявых, самых перадавых арганізацый партыі Леніна—Сталіна.

Згуртуемся-ж, таварышы, яшчэ мацней, яшчэ цясней вакол ленінска-сталінскага ЦК, вакол нашага вялікага правадыра таварыша Сталіна і, сакрушаючы ўсе перашкоды на сваім шляху, пойдзем разам з усёй партыяй наперад да поўнай перамогі комунізма.

Аб'яўляю XVIII з'езд Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі закрытым.

Няхай жыве наша пабеданосная партыя Леніна — Сталіна!

Няхай жыве ленінска-сталінскі Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў)!

Няхай жыве наш мудры правадыр і настаўнік — родны таварыш Сталін!

**У зале ўзнікае магутная доўгая авацыя. Раздаюцца воклічы: «Вялікаму Сталіну — ура!», «Няхай жыве непераможны сцяг Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна!», «Няхай жыве ленінска-сталінскі Цэнтральны Камітэт нашай партыі!», «Вялікаму Сталіну — слава!», «Ура!», «Няхай жыве вялікі Сталін!».**

Пад зводамі зала грымяць гукі пролетарскага гімна «Інтэрнацыянал», якія клічуць да новых перамог у славу соцыялістычнай радзімы, у славу магутнай, непераможнай партыі Леніна — Сталіна.